# Добрыя вечкі

04.04.2020 14:48, Гродзеншчына

Піянерская дружына імя А.Клімко Мінойтаўскай сярэдняй школы прымае актыўны ўдзел у раённай сацыяльна-экалагічнай акцыі “Новае жыццё ў абмен на вечкі”. Акцыя праводзіцца з 11 лістапада 2019 года па 20 красавіка 2020 года. Дзеці ўключаюцца ў дзейнасць па эканоміі і другаснай перапрацоўцы рэсурсаў, звяртаюць увагу на традыцыі клапатлівага стаўлення да тых, хто аказаўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.



Удзельнікам конкурсу неабходна сабраць максімальную колькасць пластыкавых вечак з маркіроўкай “02”, “04”, “05” ад пластыкавых (ПЭТ) бутэлек (вады, газаваных напіткаў, малочных і кісламалочных прадуктаў). У адрозненне ад бутэлек, вечкі зробленыя з іншага віду пластыку, таму бутэлькі можна адправіць у спецыяльныя кантэйнеры для паасобнага збору смецця, а вечкі — на добрую справу. Школьнікі інфармаваны аб тым, што сабраныя вечкі перадаюцца перапрацоўчым арганізацыям, а за кошт сродкаў, атрыманых ад іх продажу, будуць набыты медыкаменты і медабсталяванне для перадачы хворым дзецям.



У 2018/2019 навучальным годзе наша дружына заняла трэцяе месца ў гэтым раённым конкурсе. У бягучым годзе на савеце дружыны піянеры прынялі цвёрдае рашэнне ўмацаваць лідарскія пазіцыі.Члены савета дружыны размясцілі інфармацыю на стэндзе БРПА ў школе, расказалі пра мерапрыемства ў сваіх атрадах. Першым даручэннем для будучых акцябрат было заданне — прыняць актыўны ўдзел у акцыі. І яны не падвялі! Напрыклад, самы актыўны ўдзельнік акцыі Аляксей Ярашэвіч сабраў разам са сваёй сям’ёй 3150 вечак, а яго аднакласнік Яраслаў Ракса — 1300!



Каб прыцягнуць яшчэ больш увагі да такой патрэбнай справы, падчас школьнага лагера для вучняў пачатковай школы ладзілася мерапрыемства “Добрыя вечкі”. Хлопчыкі і дзяўчынкі з вялікім задавальненнем прыносілі вечкі, і кожны атрад выкладаў з іх карцінкі.



Алена ВІШНЕЎСКАЯ, педагог-арганізатар ДУА «Мінойтаўская сярэдняя школа»

https://ng-press.by/grodzenshchyna/dobryya-vechki